**Урок па вучэбным прадмеце “Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі” па тэме “Першая сусветная вайна як рубежны перыяд сусветнай гісторыі” (11 клас)**

**Аляксандр Уладзіміравіч Кныш,**
настаўнік гісторыі
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Бярозавіцкай сярэдняй школы Пінскага раёна

**Урок прысвечаны вывучэнню Першай сусветнай вайны як пераломнага моманту ў гісторыі чалавецтва. На занятках спалучаюцца розныя метады: франтальнае апытванне, аналіз карт і відэафрагментаў, а таксама групавая дзейнасць для вывучэння мэт краін-удзельніц. У выніку ўрока вучні не толькі засвойваюць важныя гістарычныя факты, але і развіваюць навыкі аналізу, працуючы з праблемным пытаннем аб імперыялістычным характары вайны.**

**Мэта:** фарміраванне ў вучняў уяўлення аб маштабах, прычынах, ходзе і асноўных выніках Першай сусветнай вайны.

**Задачы:**

– стварыць умовы для азнаямлення вучняў з храналагічнымі рамкамі вайны, краінамі-ўдзельніцамі, ваенна-палітычнымі блокамі, асноўнымі падзеямі Першай сусветнай вайны і гістарычнымі асобамі, якія адыгралі ў ёй значную ролю.

– развіваць уменні паказваць на гістарычнай карце краіны – удзельніцы Першай сусветнай вайны, характарызаваць палітычныя падзеі на аснове тэксту падручніка і дадатковага матэрыялу, выказваць свае меркаванні.

– выхоўваць адмоўнае стаўленне да вайны і жорсткасці, павагу да чалавечага жыцця як вышэйшай каштоўнасці.

**Абсталяванне:** мультымедыйная ўстаноўка, карта “Першая сусветная вайна”, атласы.

**Тып урока**: камбінаваны.

## Ход урока

**I. Арганізацыйны этап**

– Праверка адсутных.

– Арганізацыя рабочага месца вучня.

**II. Этап праверкі дамашняга задання (франтальнае апытванне)**

**Пытанні па тэме “Развіццё культуры Беларусі ў XIX– пачатку XX стагоддзя”**:

– Як навукова-тэхнічны пагрэс уплываў на развіццё культуры? *(Прывядзіце прыклады.)*

– Назавіце асноўныя асаблівасці развіцця беларускай культуры? Якімі падзеямі і з’явамі яны былі абумоўлены?

– Які ўплыў на нашу культуру аказвала польская і руская культура? *(Прывядзіце прыклады.)*

– З імёнамі якіх пісьменнікаў звязана прызнанне існавання беларускай мовы?

– Што з’явілася галоўным доказам самастойнасці нашай мовы? Дзе знаходзіцца помнік літары “Ў” ?

– Назавіце самыя вядомыя творы і тэматыку беларускай літаратуры канца XIX– пачатку XX стагоддзя?

– Назавіце творы беларускага мастацтва, якія з’яўляюцца прадметам гонару сучасных беларусаў? Якія напрамкі ў развіцці беларускага мастацтва вам вядомы? Дайце кароткую характарыстыку кожнаму напрамку.

– Якія змены адбыліся ў сістэме адукацыі XIX – пачатку XX стагоддзя? *(Прывядзіце прыклады.)* На якія групы насельніцтва была разлічана тагачасная сістэма адукацыі і чаму?

**III. Этап вывучэння новых ведаў і спосабаў дзейнасці**

Уступнае слова настаўніка:

– Гэта падзея з’яўлялася вынікам супярэчнасцей паміж буйнейшымі еўрапейскімі краінамі. Іх спрэчкі за чужыя тэрыторыі, рынкі збыту тавараў і крыніцы сыравіны прывялі да сутыкнення і зрабілі агульнасусветны канфлікт непазбежным. Фабрыканты і фінансісты, на прадпрыемствах якіх выраблялася зброя, імкнуліся да максімальных прыбыткаў. Палітычныя дзеячы, якія адстойвалі іх інтарэсы, прывялі свет да кровапралітнай вайны.

– Як вы думаеце, аб чым пойдзе гаворка на сённяшнім уроку?

*(Абагульненне адказаў вучняў і вызначэнне тэмы – “Першая сусветная вайна, як рубежны перыяд сусветнай гісторыі”.)*

– Адкрыйце сшыткі і запішыце тэму ўрока. *(Тэма урока запісана на дошцы.)*

– Паглядзіце на воблака слоў і вызначце мэту нашага ўрока.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА




– Працаваць мы будзем па наступнаму плану. *(План запісаны на дошцы.)*

План вывучэння новай тэмы:

1. Прычыны і характар вайны.
2. Асноўныя ўдзельнікі вайны.
3. Тэатры і ход ваенных дзеянняў.
4. Новае аблічча вайны.
5. Геапалітычныя наступствы вайны.

У канцы ўрока вы павінны будзеце адказаць на пастаўленае пытанне. *(Пытанне размешчана на дошцы.)*

– Чаму Першую сусветную вайну называюць імперыялістычнай?

*Прычыны і характар Першай сусветнай вайны.*

Супярэчнасці паміж еўрапейскімі краінамі паставілі свет на парог сусветнай вайны Але былі людзі, якія лічылі, што такая вайна ніколі не пачнецца. Сярод іх быў амерыканскі журналіст Норман Энджэл. Чаму ён так лічыў, вы даведаецеся прачытаўшы дадатковы матэрыял на 162 старонцы падручніка.

***Работа з дадатковым матэрыялам.*** *(Вучням прапануецца самастойна прачытаць дадатковы матэрыял на старонцы 162 і адказаць на пытанне:*

– Чаму журналіст Норман Энджэл лічыў, што сусветная вайна немагчыма?

*Асноўныя ўдзельнікі вайны і іх мэты.*

Арганізоўваецца работа ў групах.

1 група:

– прачытаць тэкст у падручніку на старонках 162–164;

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

– назваць краіны, якія ўваходзілі ў Антанту, і паказаць на карце;

– назваць мэты краін Антанты.

2 група:

– прачытаць тэкст у падручніку на старонках 162–164;

– назваць краіны, якія ўваходзілі ў Траісты саюз і паказаць на карце;

– назваць мэты краін Траістага саюза.

**Фізкультхвілінка**

**Работа з картай.**

Асноўным тэатрам баявых дзеянняў быў еўрапейскі, але баявыя дзеянні ішлі на Ціхім і Атлантычным акіянах і ў калоніях. *(Паказваюць на карце.)*

Вучням прапануецца прагледзець відэаўрывак і назваць, што з’явілася штуршком да пачатку вайны. *(Прагляд відэаўрыўка, адказы навучэнцаў.)*

Пачаткам баявых дзеянняў лічыцца **1 жніўня 1914 года.** *(Вучні запісваюць дату ў сшытак.)*

Немцы ў гэтай вайне імкнуліся да “бліцкрыгу” (маланкавай вайны). У планах было хутка разграміць сілы Францыі і Вялікабрытаніі, а потым – Расію, але ў бітвах на Марне **(5 – 12 верасня 1914 года)** і пад Вердэнам **(люты – снежань 1916 года)** нямецкія войскі былі спынены і вайна стала пазіцыйнай. *(Работа з картай.)*

Першая сусветная вайна стала палігонам для іспыту новых відаў зброі, якія прынеслі ўдзельнікам вайны велізарныя страты.

Вучням прапануецца прагледзець відэаўрывак. *(Прагляд відэаўрыўка.)*

– Які від зброі быў выкарыстаны ўпершыню?

– Як называецца атрутны газ?

– Дзе на тэрыторыі Беларусі ён упершыню быў выкарыстаны?

– Асноўнай падзеяй на Усходнім фронце стаў **“Брусілаўскі прарыў” (1916 год).** Рускія войскі разграмілі аўстра-венгерскую армію. (*Паказ на карце.*)

Зацяжная вайна прывяла да палітычнага крызісу, што стала прычынай рэвалюцыі ў Расіі **(1917 год)**. Брэст-Літоўскі мірны дагавор (**3 сакавіка 1918 года)** прывёў да выхаду краіны з вайны. *(Вучні запісваюць даты ў сшытак.)*

Германія пасля гэтых падзей імкнулася атрымаць перамогу на Заходнім фронце, але Вялікабрытанія, Францыя і ўступіўшыя ў 1917 годзе ў вайну ЗША спынілі яе наступленне. Гэтыя падзеі, а таксама лістападаўскія рэвалюцыі ў Германіі і Аўстра-Венгрыі прывялі да іх капітуляцыі. **11 лістапада 1918 года** Першая сусветная вайна скончылася. Усяго ў гады Першай сусветнай вайны загінула 10 млн. чалавек

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Цікавы факт**: Буйнейшым пахаваннем Першай сусветнай вайны лічыцца брацкая магіла каля пасёлка Саўхознае Калінінградскай вобласці, дзе пахавана больш за 1000 расійскіх і нямецкіх салдат.

– А дзе ў нашай мясцовасці знаходзіцца брацкае пахаванне часоў гэтай вайны? ***(Вёска Дубае Пінскага раёна.)***

Геапалітычным вынікам Першай сусветнай вайны стаў распад чатырох імперый: Расійскай, Германскай, Аўстра-Венгерскай і крыху пазней – Асманскай, а таксама ўзнікненне на іх месцы новых дзяржаў. (*Паказ на карце.)*

Агульныя вынікі вайны – больш як 10 мільёнаў загінуўшых, што стала самымі высокімі стратамі за ўсю тагачасную гісторыю. Але вайна, у якой узельнічала 38 краін і 70 мільёнаў чалавек, так і не вырашыла ўсіх супярэчнасцей. Яе вынікі паслужылі прычыный для новай, яшчэ больш страшнай і разбуральнай Другой сусветнай вайны.

**IV. Этап замацавання**

Прыём "Няскончаная прапанова". *Зачытваюцца нясконченыя прапановы. Вучні запісваюць у сшытках, а затым, абмяняўшыся сшыткамі, правяраюць правільныя адказы, якія паведамляе настаўнік*.

1. Датай пачатку Першай сусветнай вайны лічыцца.... *(1 жніўня 1914 года).*
2. Франц Фердынанд быў забіты ў горадзе ... *(Сараева).*
3. У планы Францыі ўваходзіла вяртанне...*(Эльзаса і Латарынгіі).*
4. Антанта была канчаткова сфарміравана ў...*(1907 годзе).*
5. Галоўная мэта англійскага ўрада заключалася ў разгроме....*(Германіі).*
6. Першай абвясціла вайну Сербіі... *(Аўстра-Венгрыя).*
7. Абаронцам і заступнікам сербаў у вайне стала ... *(Расія).*
8. Траісты саюз быў створаны ў...*(1882 годзе).*
9. 1 жніўня 1914 года вайну Расіі абвясціла....*(Германія).*
10. На баку Антанты ў жніўні 1914 года выступіла азіяцкая дзяржава....*(Японія).*

**V. Этап падвядзення вынікаў**

Вучні адказваюць на праблемнае пытанне.

Выстаўленне адзнак.

**Рэфлексія**

Сёння на ўроку я даведаўся …………

**Дамашняе заданне** §15, пытанні 1–5.

**Літаратура**

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

1. Каханоўскі А. Г., Кошалеў У. С., Цемушаў С. М., Мох А. М., Мезга М. М., Корсак А. І., Маскевіч Г. І., Ходзін С. М. “Гісторыя Беларусі у кантэксце Сусветнай гісторыі”. – Мінск : Народная асвета, 2025.

NG PRESS ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА